# Наша моладзь — лепшая!

## Што патрэбна сёння прадстаўнікам творчай моладзі Беларусі, каб плённа працаваць на карысць сваёй Радзімы?

Адказ на гэтае пытанне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку далі маладыя мастакі, музыкі, архітэктары, рэжысёры, акцёры, журналісты і пісьменнікі.

Сустрэча адбылася 1 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, куды моладзь прыйшла не столькі прасіць дапамогі, колькі паказаць, што дзяржава недарма ўкладае сілы ў выхаванне талентаў: ад пачатку стварэння Фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі яго лаўрэатамі і стыпендыятамі сталі амаль дзве тысячы маладых людзей. "Мы выгадавалі новае пакаленне творчай інтэлігенцыі, тых, каму можна даверыць памнажэнне патэнцыялу айчыннай культуры", — адзначыў Кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пабачыў і матэрыяльныя доказы пліннай працы маладых аўтараў: мастацкія і скульптурныя работы, мадэлі адзення, архітэктурныя праекты, вырабы з керамікі, металу і шкла, першыя кнігі пісьменнікаў і многае іншае.

Практычны падыход сучаснай моладзі адчуваўся па многіх узнятых пытаннях: музыкантам патрэбны інструменты, акцёрам і рэжысёрам — тэатры, мастакам — майстэрні, пісьменнікам — чытачы... Але ці павінна дзяржава клапаціцца пра ўсё гэта? Нягледзячы на тое, што выхаванне талентаў — адзін з важнейшых напрамкаў сацыяльнай палітыкі Беларусі, Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што "сёння ў культуры акрамя творчых здольнасцей яшчэ патрэбны ініцыятыва, энергія і прадпрымальнасць". А значыць, павінны развівацца таксама інстытуты прадзюсарства ды мецэнацтва. Гэта ж дазволіць пазбегнуць папрокаў у заангажаванасці творцаў, у тым, што яны працуюць "пад уладу".

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

# Наша моладзь — лепшая!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, з вуснаў многіх удзельнікаў сустрэчы прагучала думка, што яны хочуць жыць толькі на сваёй зямлі. І хаця многія з іх як пераможцы міжнародных конкурсаў і гастралюючыя артысты больш вядомыя менавіта за мяжой, творчая моладзь адчувае падтрымку беларускай дзяржавы і імкнецца вяртацца дадому. "Стварайце ў інтарэсах свайго народа, дзе б вы ні былі. Каб потым не было балюча і крыўдна, помніце пра свой кавалак зямлі, нават калі вы будзеце зарабляць грошы ў іншай краіне. Помніце, адкуль вашы карані. Не сварыцеся са сваёй краінай, з яе прынцыпамі і ідэаламі, якімі яны ні былі б", — заклікаў Аляксандр Лукашэнка. На прыкладах нашай гісторыі і культуры варта выхоўваць мастакоў-патрыётаў, на думку Міністра культуры Беларусі Паўла Латушкі. Апошні не толькі распавёў пра тое, што робіцца ў нас для развіцця творчых асоб, але і акрэсліў канкрэтныя задачы, сярод якіх прыцягненне прыватных сродкаў і фарміраванне пры ўстановах культуры апякунскіх саветаў з прадстаўнікоў банкаў і прыватнага бізнесу, а таксама распрацоўка і ўкараненне мэтавага падыходу да фінансавання ідэй і праектаў моладзі: "ад кіравання выдаткамі — да кіравання вынікамі".


Фота БелТА

А ўвогуле і Прэзідэнт, і ўсе прысутныя на сустрэчы прадстаўнікі ўлады разумеюць, што для творчага чалавека найбольш важнае — прызнанне і падтрымка на самым пачатку гэтага няпростага шляху. Так, кіраўнік тэатра сучаснай харэаграфіі "D.O.Z.SK.I" Дзмітрый Залескі выказаў удзячнасць Прэзідэнту за падтрымку пазашкольнага навучання, а спявачкі Алена Ланская і Анастасія Віннікава ўзгадалі, як важна ім было ў свой час пачуць ухвальнае слова Кіраўніка дзяржавы.

Адна з праблем, якая паўстала падчас абмеркавання, — тое, што часам самі маладыя людзі не ведаюць пра існаванне адпаведных суполак і творчых цэнтраў. Магчыма, якраз 1 снежня многія знайшлі адно аднаго і надалей будуць працаваць разам.

Зразумела, не ўсе прапановы атрымалі падтрымку Кіраўніка дзяржавы, аднак галоўнае — Прэзідэнт яшчэ раз адзначыў, што "наша моладзь — лепшая", а значыць, мы хутка ўбачым вынік яе працы ў выглядзе мастацкіх твораў і прызоў на самых пачэсных сусветных конкурсах! А яшчэ Аляксандр Рыгоравіч прызнаўся, што важнасць падобных сустрэч для яго заключаецца не толькі ў вырашэнні агучаных праблем, але і ў тым уплыве, які творчая моладзь аказвае і на яго…

**Таццяна СІВЕЦ**

***На здымку: Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання выстаўкі.***